КАБ ЗЯМЛЯ НЕ СТАЛА ПУСТЫНЯЙ

Што прадпрымаецца ў краіне для спынення дэградацыі зямель

Сёння ў многіх пунктах планеты землі імкліва страчваюць сваю прадукцыйнасць. Па ацэнках спецыялістаў, ва ўсім свеце ўжо дэградавала каля двух мільярдаў урадлівых зямель. Даследаванні паказалі: штогадовая страта 75 млрд тон глебы з ворных зямель прывядзе да неатрымання эканамічных выгад у суме 400 млрд долараў ЗША ў год.
У Беларусі прыродныя ўмовы выключаюць развіццё апустыньвання ў крайніх формах.
Тым не менш барацьба з дэградацыяй зямель — адзін з галоўных кірункаў прыродаахоўнай палітыкі.

Навуковы погляд на ўрадлівасць

Паводле даных харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ФАО (Food and Agriculture Organization — арганізацыя ААН, асноўная задача якой — барацьба з голадам. — **Зв.**), да 2050 года насельніцтва Зямлі павялічыцца да 9 млрд чалавек. У той жа час штогод з сельскагаспадарчага абароту выключаецца каля 50 млн га ўрадлівых зямель. У выніку харчовая бяспека многіх краін свету можа апынуцца пад пагрозай. Менавіта таму вырашэннем пытання захавання глебы сёння займаюцца многія навукоўцы планеты.

Для Беларусі, па словах **дырэктара Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі Віталія ЛАПЫ**, таксама актуальныя пытанні захавання ўрадлівасці глебаў і абароны ад пяці відаў дэградацыі (фізічнай, профільнай, хімічнай, біялагічнай і ландшафтна-экалагічнай).

— Фізічная дэградацыя глебаў звязана з пераўшчыльненнем, калі па вільготнай зямлі рухаецца цяжкая колавая тэхніка. У выніку да 30 % глебы пераўшчыльняецца, там зніжаецца натуральны воднапаветраны рэжым, пагаршаюцца ўмовы развіцця і змяншаецца прадукцыйнасць вырошчвання культур. Але профільная дэградацыя больш небяспечная, паколькі адбываецца эрозія глебаў.

Эрозіі глебы па тэрыторыі краіны адрозніваюцца. Напрыклад, для Беларускага Паазер'я больш характэрная водная эрозія глебаў, паколькі гэта рэгіён з вялікай колькасцю рэк і азёр. Гранічна дапушчальны змыў глебы, пры якім пачынаецца водная эрозія, складае дзве тоны з га. Для вырашэння гэтай праблемы ў краіне рэкамендавана глебаахоўнае земляробства, якое прадугледжвае ўлік водаахоўных зон (недапушчэнне ўзворвання каля самага воднага люстра), правільны падбор культур.

Навукоўцы падлічылі: калі вырошчваюцца прапашныя культуры, то за год з 1 га зямлі губляецца 240 кг перагною, да 13 кг азоту, 6 кг фосфару, 5 кг калію, якія часта сыходзяць у водныя крыніцы. А падчас вырошчвання шматгадовых траў страты рэзка зніжаюцца: перагною — да 6 кг, азоту — да 0,1 кг, фосфару і калію — да 0,3 і 1 кг з 1 га зямлі.

Для асушаных раёнаў Беларускага Палесся характэрныя іншыя працэсы. За 40 апошніх гадоў у Беларусі адбылося 350 пыльных бур, з іх 232, ці 66 % ад агульнай колькасці, — у гэтым рэгіёне. Тут таксама распрацавана і рэкамендавана глебаахоўная сістэма, якая прадугледжвае падбор культур, пакіданне ржэўніку для стрымлівання патокаў ветру, стварэнне лесаахоўных палос.

Хімічная дэградацыя — працэс, пры якім запас элементаў харчавання ў глебах можа памяншацца, гэта значыць, адбываецца вычарпанне глебы або паніжаецца яе кіслотнасць. Каб спыніць гэтыя працэсы, уносяцца мінеральныя і арганічныя ўгнаенні. З 2008 года іх аб'ёмы значна павялічыліся і дасягалі 313 кг на 1 га, што супастаўна з еўрапейскім узроўнем. Акрамя таго, у сумарнай колькасці ў сярэднім у Беларусі ўносіцца каля 55 млн тон арганічных угнаенняў.

— За апошнія 10 гадоў у нас павялічыліся запасы фосфару і калію ў глебах, перагною, — кажа Віталій Лапа. — Сёння сярэдні паказчык кіслотнасці глебаў складае 5,84 pH, які ў прынцыпе задавальняе большасць сельскагаспадарчых культур. Працэс хімічнай дэградацыі глебаў у Беларусі не толькі прыпынены, але і назіраецца выразная тэндэнцыя да павышэння ўрадлівасці.

Падчас біялагічнай дэградацыі ідзе скарачэнне колькасці відавой разнастайнасці і аптымальных суадносін розных відаў мікраарганізмаў, забруджванне глебы патагеннымі арганізмамі, пагаршэнне санітарна-эпідэміялагічных паказчыкаў. Гэта праблема часцей за ўсё звязаная са сцёкамі з жывёлагадоўчых аб'ектаў.

Зямельная палітыка

Каб беларускія глебы заставаліся ўрадлівымі, у краіне рэалізуецца Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель на 2016—2020 гады, створаны каардынацыйны савет.

Як расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Андрэй КУЗЬМІЧ**, у 2017 годзе большасць запланаваных мерапрыемстваў была выканана ці прадаўжае выконвацца, калі яны разлічаны на доўгі тэрмін. Сёлета ж плануецца правесці рэканструкцыю і аднаўленне ўчасткаў меліярацыйных сістэм на плошчы звыш 34 тысяч га; падтрыманне ўрадлівасці глебаў сельгасземляў праз унясенне арганікі; рэкультывацыю 114 унутрыгаспадарчых кар'ераў; экалагічную рэабілітацыю парушаных балот і тарфянікаў; перавод участкаў зямель, схільных да дэградацыі, у катэгорыю зямель ляснога фонду з лесаразвядзеннем. Працягнуцца работы па ўкараненні тэхналогій мінімальнай апрацоўкі глебы, дакладнага земляробства і інш.

Рашэнне гэтых пытанняў, па словах Андрэя Кузьміча, плануецца за кошт бюджэтных сродкаў, уласных сродкаў землекарыстальнікаў, а таксама праз міжнародную тэхнічную дапамогу.

Сёлета будуць падрыхтаваны навуковыя абгрунтаванні па экалагічнай рэабілітацыі чатырох участкаў неэфектыўна асушаных лясных тарфянікаў у Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцях, а ў наступныя гады запланавана непасрэдна правядзенне гэтых работ. Таксама пры падтрымцы Сакратарыята Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем і дэградацыяй зямель прыцягнутыя сродкі міжнароднай тэхнічнай дапамогі на аднаўленне не менш як 1000 га парушаных тарфянікаў Магілёўскай вобласці. Вядзецца таксама і падрыхтоўка праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове і выкарыстанні балот (тарфянікаў)».

— Пэўныя неспрыяльныя ці не вельмі характэрныя для нашых шырот прыродныя з'явы часам адзначаюцца, а са змяненнем клімату яны могуць нарастаць, — прагназуе Андрэй Кузьміч. — Таму своечасовая работа па прадухіленні дэградацыі зямель мае вялікае значэнне для экалагічнай раўнавагі і эканамічнага дабрабыту.

Вольга ПРАЛЮК,
Вераніка КОЛАСАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ

11 сентября 2018 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления	Начальная цена предмета аукциона*, бел. руб.	Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и **дополнительно** расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства) Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения				
1	Участок № 81-А к/н 321084800019000069, площадь 0,1029 га. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1029 га (водоохранная зона реки Сож)	6 616,22	910,74	662,00
2	Участок № 61-2 к/н 321084800019000068, площадь 0,0742 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож); в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей); в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения	4 770,88	1012,7	477,00
3	Участок № 45 к/н 321084800019000048, площадь 0,0946 га. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0946 га (водоохранная зона реки Сож)	5 897,90	896,08	590,00
На право заключения **договоров аренды** земельных участков сроком на 49 лет. Земельный участок в садоводческом товариществе «Родник-Полесье» Улуковского сельсовета Гомельского района				
4	Участок № 38, к/н 321089200044000030, площадь 0,0696 га. ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,0696 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов), на земельном участке имеются здания и сооружения, подлежащие сносу	823,83	1287,11	82,40

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета, г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок: 8 0232 36-03-21.

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY21302, УНП 400178549. Место, дата. время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123, тел. 36-03-21. Дата и время начала и окончания приема заявлений с 11.08.2018 по 6.09.2018 с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.00.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы. Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 36-03-21.

*первоначальная цена предмета аукциона может быть изменена при изменении курса доллара на дату принятия решения.

Извещение о проведении 23 августа 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

Предмет торгов
«здание конторы» с инвентарным номером 712/С-234 общей площадью 48 кв. м, назначение – здание специализированное по ремонту и содержанию автомобильных дорог; «гараж» с инвентарным номером 712/С-235 общей площадью 177 кв. м (в том числе забор деревянный, решетчатый на бетонных, деревянных столбах, протяженность 40,3 м), назначение – здание специализированное по ремонту и содержанию автомобильных дорог
Площадь земельного участка – 0,1441 га, кадастровый номер – 722580408101000002
Местонахождение – Могилевская обл., Кировский р-н, Боровицкий с/с, п. Скачек, ул. Шоссейная, 1
Начальная цена – 3 867,60 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 386,00 бел. руб.

Продавец имущества – ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (8017) 507-61-83.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 23 августа 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.08.2018 по 21.08.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ №7»).